28 лютага 2022 г. у “Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры” адбылася III-я Навукова-практычная канферэнцыя “Беларусь, ты збудавана з беларускіх слоў!”, прымеркаваная да Міжнароднага Дня роднай мовы.

Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена амаль 60 заявак вучняў VIII-XI класаў г. Мінска і Мінскай вобласці. Арганізацыйны камітэт канферэнцыі адабраў 50 работ. Канферэнцыя праводзіцца ў дзвюх секцыях: літаратуразнаўчай і краязнаўчай.

Па выніках разгляду заявак самымі папулярнымі асобамі, да жыцця і творчасці якіх звярнуліся ўдзельнікі, сталі майстры мастацкага слова – пісьменнікі-юбіляры гэтага года: Уладзіслаў Галубок, Зоська Верас, Максім Танк, Алесь Адамовіч, Міхась Стральцоў, Янка Брыль.

Лаўрэатамі канферэнцыі сталі:

Краязнаўчая секцыя I месца **Яўген Сяргеевіч Звяруга**, 11 клас, ДУА “Сваткаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа імя Максіма Танка”, аг.Сваткі, Мядзельскі р-н, Мінская вобл., Беларусь; навуковы кіраўнік – **Ганна Кірылаўна Тачыцкая**.

## РАДАВОД МАКСІМА ТАНКА

У сучаснай навуковай літаратуры ёсць шмат публікацый пра творчасць Максіма Танка. Гэта і “Максім Танк. Жыццё ў паэзіі”, “Максім Танк: Стыль пісьменніка” М. Арочкі, “Максім Танк” В. Рагойшы, “Паэзія Максіма Танка” Дз. Бугаёва, “Максім Танк і сучасная беларуская лірыка” М. Мікуліч, “Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці” У. Калесніка, “Паэзія і час: Літаратурнакрытычныя артыкулы” А. Лойкі і інш.

Але звестак пра род, пра карані паэта сустракаецца вельмі мала. Гэта ў асноўным успаміны сына Максіма Танка – Максіма Скурко. “Запомніўся ён мне сапраўдным сем’янінам”, “Невядомы Максім Танк”, а таксама ўспаміны тых, хто ведаў яго асабіста: М. Захарэвіч, А. Нафрановіча, П. Жукава.

Таму дадзеная даследчая праца накіравана на дапаўненне гэтай тэмы. Мы, землякі паэта, узялі на сябе такую адказнасць дзеля ўшанавання памяці аб вялікім Песняру. А мэтай працы з’яўляецца стварэнне радавода Максіма Танка.

Актуальнасць, запатрабаванасць, практычнасць, маштабнасць даследавання грунтуецца на адметнай падзеі – падрыхтоўцы да святкавання 110-годдзя з Дня нараджэння нашага земляка Максіма Танка. Пры складанні радаводаў даследчыкі карыстаюцца ў асноўным традыцыйнымі метадамі і выкарыстоўваюць традыцыйныя матэрыялы архіваў: пісьмовыя дакументы, кіна- і фотадакументы, перыядычныя выданні.

Пры напісанні дадзенай даследчай працы за аснову пры вывучэнні пытання быў пакладзены метад вуснай гісторыі. Гэты метад дае магчымасці даследчыку звярнуцца да жывой крыніцы ведаў, непасрэднага ўдзельніка таго гістарычнага перыяду, які нас цікавіць, адчуць яго эмоцыі, перажыванні, дробязі, што захаваліся ў памяці суразмоўцы і не могуць захавацца ў архіўных пісьмовых матэрыялах.

Сам працэс збору і апрацоўкі матэрыялаў з дапамогай названага метаду больш цікавы і захапляльны ў параўнанні з працай у дзяржаўных установах з папяровымі носьбітамі інфармацыі. Бо ў час працы не толькі збіраецца канкрэтныя звесткі, факты пра асобу, але і раскрываецца яе сутнасць, характар, чалавечыя якасці.

Работа накіравана на збор і захаванне гістарычнай і культурнай спадчыны, бо мы павінны ведаць, хто мы і адкуль мы? І пакуль мы ведаем свае карані, пакуль паважаем сваіх продкаў, мы будзем існаваць як народ, як нацыя. Страцім карані свайго паходжання – страцім сябе, ператворымся ў безаблічную шэрую масу.

Мы лічым, што ўсё сказанае вышэй адносіцца ў роўнай ступені да кожнага з нас. Ведаючы сваю гісторыю, сваю Радзіму, нам лягчэй зразумець сябе. Шануючы родную зямлю, мы атрымліваем права людзьмі звацца.

Максім Танк… Чалавек з вялікай літары – мудры, верны, чулы, сардэчны, шчыры, просты… Дзе ж вытокі яго сілы, песні, карані яго мудрасці і чалавечнасці? Сам Яўген Іванавіч на гэтае пытанне даваў такі адказ: “Самыя светлыя, самыя лепшыя вершы знаходзіў я на роднай зямлі”.

І сапраўды, пра што б ні гаварыў паэт, у якія далечы ні сягала б яго натхненне, ён ніколі не забываўся пра той самы дарагі і запаветны край, дзе “сэрца званчэйшыя песні вядзе”. Ён раз за разам вяртаўся да родных вытокаў, да “бацькоўскай прызбы з шэрых валуноў”, да мілых сэрцу пількаўскіх мясцін, адкуль пачалася жыцця дарога.

“Пількаўшчына! Здаецца, нічога прывабнага няма. Балоты, пералескі, буі, грэблі, валуны ды крушні… Але ўсё гэта для мяне з’яўляецца такім блізкім, ад чаго, як ад лёсу, нельга ўцячы, каб і хацеў”. Такі запіс зрабіў 7 мая 1939 Максім Танк у сваім дзённіку, які потым лёг у аснову кнігі “Лісткі календара” (1967). Пількаўшчына (зараз у Сваткаўскім сельскім савеце, на Мядзельшчыне) жыла ў думках і сэрцы паэта.

Даўней на месцы сённяшняй Пількаўшчыны была прыгожая палянка, акружаная дрымучым борам ды імшарным лесам, акаймаваная магутнымі дубамі, прыбярэжнай ракітай, вербамі. Кажуць, нібыта вёску назвалі гэтак таму, што тут рос такі лес, які маглі зваліць толькі пілою. Іншыя гавораць, што калі высякалі ўрочышча Вялікі Бор, дык ірваліся і самыя моцныя пілы, бо там раслі надта ж тоўстыя старадрэвіны. З суседняй вёскі Новікі (Слабады) пераехала сюды некалькі сем’яў. Забудаваліся… Старыя і цяпер успамінаюць сівую мінуўшчыну і аднаго з заснавальнікаў вёскі – прадзеда Максіма Танка – Марку Скурко.

Марка Скурко. Адзін з заснавальнікаў вёскі Пількаўшчына – прадзед Максіма Танка. Ён быў сапраўдным асілкам. Валіў стагадовыя сосны, цягаў велізарныя каменні на падмурак, адзін насіў на плячах бэлькі. І заўсёды сыпаў жартамі, весяліў аднавяскоўцаў. Здавалася, сіле і працавітасці яго не будзе канца. Не шкадаваў Марка сябе, не бярогся. Нёс бервяно на апошні вянок, спатыкнуўся на рыштаваннях і ўпаў…

Дзед паэта Хведар Маркавіч Скурко жыў сіратою пры дзядзьку. Падрос, стаў заўзятым паляўнічым. З гэтага і жыў. Цэлымі днямі Хведар прападаў у лесе і вяртаўся з багатай здабычай. Хведара і ў салдаты не ўзялі: валасны старшыня, які часта ласаваўся дзічынай, вызваліў хлопца ад службы. Зямлі ў яго было каля шасці дзесяцін, разам з лесам і сенакосам, а ў сям’і, акрамя бацькі і маці, – дванаццаць дзяцей. Падрасталі дзеці, раслі і клопаты, але Хведар усю сваю душу аддаваў паляўніцтву. Таму старэйшыя яго сыны і дочкі гаспадарылі, як умелі. А ў Хведара Скурко праявіўся яшчэ адзін талент – лекара. Ён лячыў ад змяінага ўкусу, добра ведаў розныя лекавыя травы, дапамагаў хворым. Дажыў Хведар да 82 гадоў. Ужо зусім старым пасвіў кароў, але на паляванне не забываўся. Так і памёр дзед на пашы, прылёгшы на кургане. Побач ляжала спадарожніца яго жыцця – паляўнічая дубальтоўка. У Хведара Маркавіча было тры сыны: Іван, Фадзей, Ціхан.

Улляна, бабка паэта (1861-1937), была чалавекам простым, сціплым, працавітым. “Вечна яна пра ўсіх непакоілася. Шкада, што пра такіх людзей не паведамляюць ні газеты, ні радыё, быццам нічога вартага ўвагі не здарылася на свеце… Колькі яна за свой век наткала палоцен, нажала снапоў, намалола мукі ў жорнах, назбірала розных гаючых зёлак, грыбоў, ягад… І, як магла, лагодзіла ўсе сваркі, берагла цяпло сям’і, пачуццё сям’і, каб, як вуголле ў пяколку, яно ніколі не згасла”, – так пісаў Максім Танк пра бабку ў “Лістках календара” [2, с. 128]. Памерла бабуля ў 1937 годзе ва ўзросце 76 гадоў.

Іван Хведаравіч Скурко, бацька паэта (1882-1968) Іван Скурко – старэйшы сын Хведара. Нарадзіўся ў 1882. Ледзь узняўся на ногі, як на яго леглі цяжкія гаспадарчыя клопаты. Быў ён не дужа пісьменны: вучыўся толькі адну зіму ў царкоўнапрыходскай школе ў в. Новікі, а потым некалькі месяцаў – у Мядзельскім народным вучылішчы. Навука невялікая, але любоў да кніг Іван Хведаравіч захаваў на ўсё жыццё. Працавіты і руплівы, Іван з ранняга юнацтва не меў вольнай хвіліны: арандаваў зямлю, шыў боты, ганяў плыты, наймаўся лесарубам, хадзіў на панскі луг капаць канавы. Не было работы, якой бы ён не ведаў ці не ўмеў рабіць. Высокага класу майстар быў. На верстаку розныя рэчы вырабляў, пчаляром быў адмысловым. Сам зрабіў усе пчаліныя домікі (іх многа было). Адным часам да яго прывезлі і паставілі па другі бок хаты калгасную пасеку. І ён даглядаў яе і сваю. Але атрымалася цікавая гісторыя. Калгасныя пчолы пачалі “біцца” з пчоламі гаспадара. Уся зямля на хутары была ўсеяна іх цельцамі. За адін дзень Івана Хведаравіча ўджалілі 110 пчол! Палічылі, калі джалы даставалі. А яму хоць бы што: толькі пачырванеў і ўсё. Быў заядлым паляўнічым, са стрэльбай не расставаўся. У 1911 Іван Хведаравіч ажаніўся. Жонкай яго стала Домна Іванаўна Хвалько.

Фадзей Хведаравіч (1885-1966) – дзядзька паэта. Гэта быў легендарны чалавек. Вельмі моцны фізічна. У 75 гадоў адзін браў бітон малака і ставіў яго на машыну. Калі распранаўся – дык адны жылы на целе. Служачы ў арміі, ён стаяў у цара на Крамлёўскіх варотах. Там падбіралі рослых, прыгожых салдат. На царскіх стрэльбішчах у якасці ганаровага прыза атрымаў залаты гадзіннік. Потым па накіраванні Расіі паехаў у Чэхаславакію, вучыўся на ветэрынара. Там далучыўся да рэвалюцыйнага руху, за што быў нават прыгавораны да расстрэлу. Але неяк яму ўдалося збегчы ў Германію. Там ён працаваў на гаспадарцы ў фермера.

Фадзей паехаў за мяжу, каб зарабіць грошай, купіць зямлі і аддзяліцца ад брата Івана, завесці сваю гаспадарку. У Германіі ён настолькі ўвайшоў у сям’ю гэтага фермера, што ледзь не ажаніўся з яго дачкой. І каханне там было. Бацькі дзяўчыны ўгаворвалі, казалі, што яны ўжо старыя і ўся гаспадарка застанецца яму. Але ў самы апошні момант ён сеў на параход і паплыў у Аргенціну. Як аказалася, на 10 гадоў. Кім ён толькі ў Аргенціне ні працаваў! І таксістам у Буэнас-Айрэсе, і на канвееры аўтамабільнага завода, і коней дзікіх аб’язджаў. На аўтамабільным заводзе такая інтэнсіўная праца была, што нават на абед ніхто не адыходзіў. Вешалася спецыяльная бляшанка, рабочы стаіць на канвееры і есць. І там у яго каханне было, але зноў не ажаніўся. Так не жанаты і застаўся. Назбіраўшы грошай, дзядзька Фадзей вярнуўся на Радзіму. Прыехаў у родную хату, а тут – рэвалюцыя. І ўсе яго зберажэнні прапалі. Так ён і застаўся жыць на хутары. Дарэчы, калі прыехаў з Амерыкі, дзядзьку Фадзея выбралі старшынёй калгаса. Яшчэ ён быў добры ветэрынар, славіўся на ўсю

Мядзельшчыну. Быў чалавекам граматным, ведаў, акрамя беларускай і рускай, польскую, чэшскую, нямецкую, іспанскую мовы, меў на гэтых мовах многа розных кніг па ветэрынарыі, леках, хімічных рэактывах, рэцэптах.

Дзядзька Фадзей быў вельмі моцны чалавек, асілак. Носячы цяжкае, нажыў грыжу. Прывезлі яго ў клініку аперыраваць. Ён лёг на стол і забараніў даваць наркоз. Аперацыю рабілі без абязбольвання. Пасля ён сам злез са стала і пайшоў у палату. І гэта чалавек пад 70 год! Дарэчы, валодаў гіпнозам. Усё жыццё дзядзькі Фадзея было адметным, смерць – таксама. Калі навалілася хвароба (астма), то ён трымаўся моцна, не перажываў і не пакутваў. Нават у бальніцы быў заўсёды вясёлы і жыццярадасны. Родныя прыйшлі да яго за пару гадзін да смерці. А ён кажа: "Праз пару гадзін я памру, дык вось сцізорык табе, гадзіннік – табе…" і г. д. і роўна праз дзве гадзіны пасля таго яго не стала [1, с. 177]. Памёр дзядзька Фадзей ад астмы ва ўзросце каля 80 гадоў.

У час Вялікай Айчыннай вайны дзядзька Фадзей выратаваў Пількаўшчыну і яе жыхароў. Каб не ён, пількаўшчан расстралялі б немцы за сувязь з партызанамі. Мужчын ужо распранулі, падрыхтавалі да расстрэлу. Жанчын з дзецьмі арыштавалі. Нямецкі афіцэр прапанаваў выдаць партызан, калі яны ёсць у вёсцы, а інакш салдаты з аўчаркамі пойдуць шукаць і тады ўжо нікога не пашкадуюць. Жыхарка вёскі Пількаўшчына Скурко Валянціна схавала ў сябе яўрэйскую жанчыну і вельмі хвалявалася. І тады дзядзька Фадзей пайшоў да нямецкага афіцэра і стаў размаўляць з ім на нямецкай мове. Ён запэўніў афіцэра, што ў вёсцы нікога чужога няма, і той адпусціў мужчын і жанчын з дзецьмі па хатах. Такім застаўся Фадзей ва ўспамінах родных і землякоў.

Домна Іванаўна Хвалько, маці паэта (1892-1971). Была родам з вёскі Задубенне, са шматдзетнай сям'і. Маці яе рана памерла, і дзяўчынка гадавалася ў чужых людзей. У жыцці Домна Іванаўна была вельмі добрая, гасцінная, прыветлівая. Частавала мёдам, марозавымі яблычкамі з гарышча. Магла ўпотайкі ад мужа падзяліцца, чым прасілі людзі, пазычыць грошы. І бацька Максіма Танка (у сям'і Янук) таксама быў добры. Яны давяралі людзям. У вайну дапамагалі раненым, рызыкавалі сваім жыццём. Дарэчы, Максім Танк пераняў шчырасць душы бацькоў. Каб хутчэй справіцца з работай у полі, наймалі касцоў, жней. Але Домна заўсёды працавала ад пачатку да канца разам з людзьмі. Шчодра карміла нанятых, добра плацілі за іх працу. Як ўспамінае ўнучка Ірына (дачка Фёдара Іванавіча), "бабуля была заўсёды нейкая сумная, задуменная. Сядзела, склаўшы рукі адна на адну. Пагляд быў нейкі аддалены. За ўсіх яна клапацілася. Бабуля і дзядуля прывучылі нас да працы. З ранняй вясны і да позняй восені я са старэйшай сястрой Таццянай і з нашай мамай Валянцінай Васільеўнай жылі на хутары. Была вялікая гаспадарка: некалькі кароў, шмат свінней, куры, гусі, авечкі. І за ўсім трэба было глядзець. Дапамагаць па гаспадарцы – было святое. Любілі і падурэць, але дзед з бабуляй нас ніколі не каралі. Адно толькі, бывала, дзед Іван гаварыў: "Як брыдка глядзець", – і гэтага хапала, каб супакоіцца".

У Домны было шмат братоў і сясцёр. Але працягваць род засталіся толькі Ігнась і Зіна. Астатнія – памерлі ў час іспанкі.

Любоў Андрэеўна Скурко (Асаевіч) (1912-1995) – жонка Максіма Танка

Сям'я Асаевічаў спачатку жыла ў Пількаўшчыне, затым пераехала ў Вільню. У Івана Асаевіча, дзеда Любы, было 8 дзяцей: Алена, Мікалай, Пётр, Аляксандра, Андрэй, Пелагея, Паўлюк, Герасім.

Андрэй Іванавіч – бацька Любашы – быў адмысловы майстар: добра выразаў з дрэва лыжкі, цацкі, хатняе начынне. Ажаніўся бацька ў Вільні, куды сям'я выехала на заробкі, на Ганне Францаўне (магчыма, па нацыянальнасці літоўка). Маці вельмі добра вязала, вывязвала ўсякімі ўзорамі сурвэткі, настольнікі, карункі. Яе вырабы і зараз захоўваюцца ў сваякоў.

Акрамя Любы, у сям'і Асаевічаў было 2 дачкі, Соня і Вольга, і 2 сыны – Віктар і Уладзімір. Уладзімір – першынец, памёр у 27 год. Віктар памёр у 7 гадоў ад менінгіту. Соф'я Андрэеўна Блятон (Асаевіч) выйшла замуж за паляка. Жыла ў Варшаве, выкладала рускую мову ў Вышэйшай гандлёвай школе. Памерла і пахавана ў Варшаве. У Соф'і нарадзілася трое дзяцей: Ганка (1938), Вячаслаў (1943), Владак (1939). У Ганкі – 2 дзяцей: сын Яцусь хварэў і памёр, дачка Кінга (1976) і цяпер жыве ў Варшаве. Вячаслаў стаў мастаком, пераехаў у Англію, у Англіі жыве і яго дачка Фібі (прыкладна 1981). Сын Владака, Людвіг, жыве ў Осла.

Вольга Андрэеўна (1900-1968) замужам была за чыгуначнікам. У яе было трое дзяцей: Леон, Эдуард, Аляксандра. Леон (1926-1982) – афіцэр Войска польскага, памёр ад інфаркту, пахаваны ў Варшаве. Апошнія гады працаваў у Міністэрстве абароны Польшчы. Эдуард памёр грудным дзіцём, не было яшчэ і года. Аляксандра (1923) мае дачку Ганну. Ганна – кандыдат гістарычных навук, сваіх дзяцей у яе няма. Жыве ў Мінску.

Любоў Андрэеўна Скурко. Люба, Любаша, Любачка, Любка, Лю – так ласкава, любоўна, пяшчотна называў Яўген Іванавіч сваю жонку. Хоць і былі яны з адной вёскі, але сустракацца сталі, калі жылі ў Вільні. Жэня Скурко вучыўся ва ўніверсітэце, часта забягаў да землякоў, якія выехалі з Пількаўшчыны раней. Выручалі аднавяскоўцы, дапамагалі, чым маглі. А калі трапіў у турму, то Люба насіла перадачы, шкадавала яго. Магчыма, яны і самі не заўважылі, што адзін аднаму прыглянуліся. На запытанне бацькоў: "Як жа ты, сынок, аддзячыш дзяўчыне?" Яўген адказаў: "Я падрыхтаваў ёй вялікі сюрпрыз: прапаную руку і сэрца". Такое прыгожае паданне пра гэта каханне жыве ў сям'і Скурко. Каханне сапраўды было ў іх прыгожае, незямное. Яно праяўлялася ў пастаянным клопаце адзін пра аднаго.

Разам адпачывалі, рыхтавалі абеды, прыбіраліся. Прычым самую цяжкую работу Яўген Іванавіч браў на сябе: не цураўся і посуд памыць, і мяса на катлеты перакруціць, і бульбу ачабраць, а рыбу прыносіў на кухню толькі пачышчаную, парэзаную, бяры – і на патэльню. Разам яны былі і ў творчай працы. "Напіша верш і ідзе да маці на кухню або яе пакліча да сябе і адразу яго прачытае. Часам і яна некалькі слоў уставіць. Бывае, ён мучыцца, хоча замяніць нейкае слова іншым, больш удалым, а ёй яно адразу падвернецца, і яна яму падкажа. Маці была першым слухачом і першым крытыкам Максіма Танка. Ну, і, канечне, натхняла яго на паэзію" [1, с. 178]. Такімі засталіся бацькі ва ўспамінах сына Максіма Яўгенавіча Скурко. Ён, сваёй вернай спадарожніцы жыцця, адзінай і непаўторнай, Максім Танк прысвяціў неўміручыя радкі. Яны нарадзіліся ў адзін год і ў адной і той жа вёсцы, пазнаёміліся і пабраліся на трывожных рэвалюцыйных дарогах, прайшлі па жыцці побач, верныя свайму каханню, ад нас пайшлі таксама ў адзін год і пахаваны ў адной магіле (на сэрцы прыхінуў паэт сваю адзіную Любоў, Любашку, Любку, Лю).

Вера Іванаўна Скурко (Лётка) – старэйшая сястра Максіма Танка (1918- 1943). Была прыгожая, працавітая дзяўчына. У 1938 яна выйшла замуж і пераехала жыць на

хутар каля вёскі Сэрвач (Вілейшчына). Максім Танк згадваў: “Заўтра еду ў Вільню. Разам са мною едзе і сястра Вера, якая выходзіць замуж за Браніслава Лётку з Сэрвачы, дзе бацька яго, вярнуўшыся з Амерыкі, купіў сабе хутар”. У Лёткаў на той час быў свой малаказавод, мелі статак у 50 кароў, сваю хлебапякарню, сажалкі з рыбай, канюшню з выязнымі коньмі.

Вера загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны пакутніцкай смерцю. Пад выглядам партызан група бандытаў уварвалася ў сакавіку 1943 у хату і запатрабавала каштоўнасцей. Злачынцы загубілі безабаронную жанчыну і яе двухгадовага сына Яраслава. Загінула і свякроў. Магіла сястры паэта і яе сына знаходзіцца на Касцяневіцкіх могілках (Вілейшчына).

Людміла Іванаўна Семяжон, малодшая сястра паэта (1926-19??) У сям’і яе звалі Мілка. Максім Танк забраў сястру з вёскі ў Мінск, прымусіў вучыцца (паступіла ў медінстытут). Закончыўшы яго, паехала працаваць у Мядзел. Мясцовыя людзі пра яе добра выказваліся, яна была вельмі душэўнай, чулай. Пазней выйшла замуж за вядомага перакладчыка Язэпа Семяжона (1914-1985). Іх пазнаёміў Максім Танк. Сям’я атрымалася цудоўная. У іх нарадзіліся дзеці: дачка Наталля (1957) і сын Пётр (1958). Атрымалі вышэйшую адукацыю. Свае сем’і не стварылі, дзяцей не маюць. Людміла захварэла на рак галаўнога мозгу і памерла. Язэп Семяжон памёр у 1985 годзе.

Фёдар Іванавіч Скурко, малодшы брат паэта (1924-2011) Фёдар быў меншы за Яўгена на 12 год. Хлопец рос жвавы, шустры, кемлівы. Але да вучобы быў не вельмі ахвочы. Федзя доўга працаваў на трактарным заводзе, у кавальскім цэху. У Мінску ажаніўся. Жонку звалі Валянціна Васільеўна Шабашова (1932), ленінградка. У Фёдара з Валянцінай нарадзіліся дзве дачкі: Таццяна (1952) і Ірына (1955). Потым у сям’і здарыўся канфлікт. Развёўшыся, Фёдар пакінуў Мінск, кватэру і вярнуўся на хутар. Там ажаніўся з Марыяй Іванаўнай Мацкевіч (1932), ураджэнкай в.Ракуці Мядзельскага раёна. У іх нарадзіўся сын Іван (1973), якога назвалі ў гонар дзеда. Іван закончыў Беларускі тэхналагічны інстытут. Жыве і працуе ў Віцебску. Жанаты. Жонка Алена, настаўніца. Маюць дачку Машу.

Фёдар Іванавіч доўгі час працаваў лесніком, пасля выхаду на пенсію ладзіў уласную гаспадарку. Як бацька і дзед, быў паляўнічым. Памёр Фёдар Іванавіч у 2011 годзе на 87-ым годзе жыцця.

Старэйшая дачка Фёдара Іванавіча – Таццяна (1952) працавала на заводзе Дармаш, зараз пенсіянерка. Яе муж – Мікалай Каляда – украінец па нацыянальнасці. Быў ліквідатарам наступстваў Чарнобыльскай аварыі. Хутка “згарэў”. Паехаў да бацькоў, там абвастрылася хвароба. Трапіў у бальніцу, дадому ўжо не вярнуўся. Пасля сябе ён пакінуў сына Дзяніса, у якога нарадзіліся Канстанцін і Соф’я.

Малодшая дачка Фёдара Іванавіча – Ірына (1952). Прапрацавала на трактарным заводзе 41 год, з іх 34 гады – у службе тэхнічнага дырэктара. Жанчына добразычлівая, працалюбівая. Муж – Скурко Валяр’ян Ісаакавіч (1952) (прозвішча ўзяў жонкі). Дачка Наталля закончыла 3 навучальныя ўстановы адукацыі: РТІ, Інстытут народнай гаспадаркі, радыётэхнічны каледж. Працавала інжынерам-праграмістам на Мінскім трактарным заводзе. Яе сын – Галагуцкі Георгій Вячаслававіч (2001). Вельмі цікавіцца аповедамі пра сям’ю, пра жыццё на хутары, марыць там пабываць. Вельмі сябруе з бабуляй Ірай. Разам займаюцца, адпачываюць.

А як склаўся лёс дзяцей і ўнукаў Максіма Танка? Сын Яўгена Іванавіча – Максім Яўгенавіч – нарадзіўся ў 1941 у эвакуацыі пад Саратавам. У Мінск пераехалі ў канцы 1944 і пасяліліся каля стадыёна на Ульянаўскай у адной кватэры з Янкам Маўрам.

У дзяцінстве Максім шмат часу праводзіў на хутары дзеда. Прыязджаў туды кожнае лета, шмат дапамагаў па гаспадарцы. Ва ўспамінах засталіся і прыгожыя мясціны, і прыгоды з дзедам Фадзеем, і ўмелыя рукі дзеда Івана, які зрабіў яму маленькую касу і граблікі, і няхітрая, але смачная ежа, прыгатаваная клапатлівай бабуляй Домнай.

Максім Яўгенавіч па прафесіі быў хімік. Хімікам была і яго жонка Вольга Фёдараўна Апацёнак. Да пенсіі Максім Яўгенавіч працаваў вучоным сакратаром Інстытута біяарганічнай хіміі Акадэміі навук Беларусі. Сын Максіма Яўгенавіча – Максім Максімавіч (1965) жыў ў сталіцы і працаваў ў аўтасервісе. Сын Максіма Танка і яго ўнук памерлі ў 2018 годзе. Падзахаваны побач з бацькамі ў вёсцы Новікі. Праўнук Максіма Танка – Яўген Максімавіч (1985) – мае дзвюх дачок (прапраўнучкі Максіма Танка): Наталлю (2002), Валерыю (2011).

У 1945 у сям'і Максіма Танка нарадзілася двойня – дзве дачкі: Іра і Вера.

Вера памерла ад рака лёгкіх. Яна была хімікам, як і яе брат. Муж Веры, Аляксандр Іосіфавіч Тушынскі (1945). Працаваў праграмістам у НДІ ЭВМ у Міністэрстве абароны. У іх два сыны: Сяргей (малодшы) і Дзяніс, якога таксама ўжо няма (1971-2004). Ірына Яўгенаўна Скурко біёлаг. Яе муж Пачанін Юрый Сцяпанавіч, кандыдат фізіка-тэхнічных навук, дацэнт БНТУ. Іх сын Сяргей (1973) закончыў радыётэхнічны інстытут, інжынер-канструктар, жыве, як і бацькі ў Мінску, а дачка Кацярына (1982) закончыла Беларускую палітэхнічную акадэмію, жыве ў Англіі, працуе маркетолагам.

Такім чынам, на аснове праведзенага даследавання па складанню радавода Максіма Танка мы адкрылі для сябе цікавыя невядомыя старонкі гісторыі роду Скурко. Знайшлі адказы на пытанні: якімі былі продкі Максіма Танка ў жыцці, у сям'і, як складваліся іх адносіны са знаёмымі і незнаёмымі людзьмі? Што любілі і цанілі, з кім сябравалі? Як склаліся лёсы родных і блізкіх?

У час вандровак, сустрэч, размоў, дакументальных пошукаў мы яшчэ раз пераканаліся, што прадстаўнікі роду Скурко – людзі працавітыя, сціплыя, простыя, шчырыя, мудрыя, добрыя, з пачуццём гумару, моцныя духам, высакародныя.

Несумненна, вынікі даследавання будуць карысны для складальнікаў уласных радаводаў, а таксама могуць быць выкарыстаны ў практыцы работы настаўнікаў-філолагаў. У гэтым тэарэтычная значнасць працы.

Практычная значнасць даследавання звязана з магчымасцю выкарыстання матэрыялаў пры стварэнні экспазіцый літаратурнакраязнаўчага музея імя Максіма Танка і для правядзення экскурсій.

Спіс літаратуры

1. Мікуліч, М. Запомніўся ён сапраўдным сем'янінам : успаміны сына пра Максіма Танка // Роднае слова. — 1997. — № 9. — С. 170 – 188.

2. Танк, М. Лісткі календара // Максім Танк. — Мінск : Беларусь, 1970. – 312 с.

3. У пошуках гісторыі / складальнік А. І. Калістратава, А. У. Радзевіч; ДУА “Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі”. – Мінск, 2011. – 128 с.